## § 49. Асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў

**306.** Прачытайце табліцу. Дапоўніце яе назвамі спосабаў словаўтварэння.

| Схема | Прыклады | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| ____ + ∧ | *марозны, іскрысты* | |
| ⎺⎺⎺⏋ + ____ | *невясёлы, антываенны* | |
| ⎺⎺⎺⏋ + ____ + ∧ | *зарэчны, бяздомны* | |
| ____ + ____ | *мала + прыкметны*<br>*вечна + зялёны* | |
| ____ + *а* + ____ | *чарнабровы*<br>*ярка-чырвоны* | |
| ____ + *а* + ____ + ∧ | *дабраякасны*<br>*вадаплаўны* | |

Якія злучальныя галосныя ўдзельнічаюць ва ўтварэнні складаных слоў?

**307.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

Ластаўчына[с] шчабятанне,
Вясёлкавае світанне,
Дыханне глебы,
Шчымлівы пах хлеба[м],
Азёры і крыніцы,
Знічкі[*]-чараўніцы,
Гарэзлівыя дзеці...
Што лепшае
Бывае ў свеце?
*В. Рагаўцоў.*

Знайдзіце ў тэксце вытворныя прыметнікі. Як яны ўтварыліся? Ці можна лічыць прыметнік *лепшы* вытворным?

**308.** Прачытайце схемы. Ад назоўнікаў утварыце прыметнікі.







Якія змены адбыліся ў асновах пры далучэнні да іх суфіксаў? З двума ўтворанымі прыметнікамі складзіце сказы.


Правообладатель Национальный институт образования

**309.** Карыстаючыся схемамі, утварыце прыметнікі.

*супер* + *мабільны*, *сучасны* =

*паза* + *леташні*, *учарашні* =

*анты* + *ваенны*, *гуманны* =

Утвораныя словы запішыце. Зрабіце іх словаўтваральны разбор.

**310.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

### Хлопчык з флейтай

Стаяў адліжны дзень. Рэдк.. сняжынкі кружыліся ў вільготн.. паветры і ціха апускаліся на шырок.. **цёмна-зялёныя** лапы ёлкі. Пад ёлкай ужо ўтварылася **немалая** лужына. І ў ёй адбіваліся **шматкаляровыя** іскрыст.. агні гірляндаў. Ды і ўсё навокал на гэтай прасторн.. гарадской плошчы выпраменьвала ўрачыст.. святочнасць[ф]. Аднак Паўлік не заўважаў яе. Ён не заўважаў, як мокр.. сняжынкі ліплі да **бяскроўнага** твару, халодн.. рук, сін.. спартыўн.. шапачкі і лёгк.. кароценьк.. курткі. Паўлік іграў на флейце. На татав.. флейце, якая засталася яму ў спадчыну.

На плошчы хлопчык апынуўся без мамінага дазволу. Але яму так хацелася зрабіць ёй, самаму дарагому для яго чалавеку, навагодні падарунак!

Ах, як шчыра іграла **Паўлікава** флейта! **Шчымлівыя** гукі поўнілі шэрую прастору, узрушвалі задушэўнай мелодыяй *(Паводле М. Зарэмбы)*.

З якой мэтай хлопчык прыйшоў на плошчу? Як ён выглядаў?

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў.

Вызначце, як утварыліся выдзеленыя ў першым абзацы словы.

Зрабіце марфалагічны разбор прыметнікаў, выдзеленых у апошнім абзацы.

Выпішыце з тэксту апорныя словы. Перакажыце тэкст па апорных словах.



Правообладатель Национальный институт образования